Цішчанка К.С., студ. гр. 302 ФК і СКД
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Тычко Г.К.,
докт. філал. навук, прафесар

# ЭКРАНІЗАЦЫЯ ТВОРАЎ ВАСІЛЯ БЫКАВА

Васіль Быкаў – гэта ўнікальная з`ява ў айчыннай і сусветнай літаратуры. Надзелены вялікім талентам, пісьменнік здолеў адказаць на хвалюючыя пытанні і праблемы як сучаснага, так і мінулага, па-мастацку адкрыць і паказаць праўду нашага жыцця, пранікнуць у таямніцы чалавечай псіхалогіі і тым самым адлюстраваць асаблівасці характару беларускага народа.

Таленавіты мастак слова Васіль Уладзіміравіч Быкаў быў вельмі цесна звязаны з кінематографам. Вядомасць яму прынесла знятая ў 1963 годзе на кінастудыі «Беларусьфільм» аднайменная стужка па аповесці «Трэцяя ракета», напісанай у 1962 годзе. Сцэнарый фільма, які дакладна ўзнаўляў літаратурны твор, быў зроблены самім аўтарам, што ўвогуле характэрна амаль для ўсіх фільмаў, знятых па яго прозе [1].

Сюжэт «Трэцяй ракеты» вельмі просты: Вялікая Айчынная вайна на Беларусі. Лёс зводзіць у адным акопе самых розных людзей, на якіх смяротнай небяспекай насоўваецца танкавая калона немцаў. У такой экстрэмальнай сітуацыі зусім нечакана пачынаюць раскрывацца чалавечыя характары [2].

Фільм не стаў вялікім дасягненнем беларускага кінематографа і не спадабаўся самому Быкаву, бо стужка прайшла цэнзуру – усе гуманістычныя ідэі пісьменніка былі загублены.

Нягледзячы на гэта, ужо ў першай экранізацыі твора Васіля Быкава выявілася яго асноўная стылістыка: абмежаваная колькасць галоўных герояў, дзеянне адбываецца ў канкрэтны час у замкнёнай прасторы; выпрабаванне чалавечых характараў праз складаныя, смяротна небяспечныя абставіны; трагізм гістарычнага лёсу нашага народа і, як правіла, гібель станоўчага героя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Наступнай экранізацыяй на кінастудыі «Беларусьфільм» у 1965 годзе стала аповесць «Альпійская балада». Рэжысёрам выступіў Барыс Сцяпанаў.

Падчас Другой Сусветнай вайны з фашысцкага канцлагеру ўцякаюць савецкі салдат Іван і італьянская дзяўчына Джулія. Яны выпадкова сустракаюцца ў перадгор`і Альпаў. Спачатку Іван жадае пакінуць слабую жанчыну, але потым вырашае дапамагчы Джуліі. Паміж імі ўзнікае каханне. Яны праводзяць у гарах некалькі дзён, але немцы знаходзяць іх, і коштам свайго жыцця Іван выратоўвае сваю каханую Джулію [3].

Кінастужка «Альпійская балада» стала самай вядомай і любімай у СССР сярод іншых фільмаў, знятых па творах Быкава. На савецкім тэлебачанні яна дэманстравалася вельмі часта, і не было нават ніводнага дарослага чалавека, які б не бачыў гэтую рамантычную і, разам з тым, трагічную, кінагісторыю. «Альпійская балада» атрымала Гран-пры на міжнародным кінафестывалі ў Дэлі ў 1968 годзе.

Да сярэдзіны 70-х гадоў было знята яшчэ чатыры быкаўскія фільмы: «Пастка» (1966, рэж. Л. Мартынюк), «Жадаю поспеху» (1968, рэж. Ул. Смагін), «Воўчая зграя» (1975, рэж. Б. Сцяпанаў), «Доўгія вёрсты вайны» (1975, рэж. А. Карпаў), «Абеліск» (1976, рэж. Р. Віктараў). Усе стужкі былі надзвычай цікавымі, аднак ніводная з іх не стала з`явай у кінематографе і не спадабалася самому Васілю Быкаву. Гэта вельмі паўплывала на пісьменніка: ён пачаў ахалоджвацца і расчароўвацца ў “кіношнай” справе [1].

У гэты час ад маскоўскага рэжысёра Ларысы Шапіцькі паступае прапанова напісаць кінасцэнарый паводле аповесці В.Быкава «Сотнікаў». Яшчэ да Л.Шапіцькі рабіліся спробы экранізаваць гэтую аповесць, аднак атрымаць дазвол ад Дзяржкіно СССР ніхто не мог. Аповесць была вельмі трагічнай, па словах кіназнаўцы Расціслава Юрэнева, «усё ў ёй змрочна, безвыходна, безнадзейна…». Аднак гэта не спыняла Ларысу Шапіцьку – яна дамаглася дазволу і сама напісала сцэнарый [3].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Партызан Рыбак і афіцэр Сотнікаў зімой 1942 года адпраўляюцца на пошукі харчавання для партызанскага атраду. Сутыкнуўшыся з паліцаямі, яны хаваюцца ў вёсцы, але іх ловяць карнікі і дапытваюць. Не жадаючы згубіць сваё жыццё, Рыбак ідзе на здраду: становіцца паліцаем і нават выбівае табурэт пад Сотнікавым, калі таго вешаюць [2]. Здымкі адбываліся на «Масфільме» у 1976 годзе, фільм атрымаў назву «Узыходжанне».

«Узыходжанне» стала адзіным быкаўскім фільмам, які яму спадабаўся. У 1977 годзе фільм атрымаў «Залатога мядзведзя» на Міжнародным кінафестывалі ў Заходнім Берліне. У СССР фільм спачатку быў забаронены і выйшаў на экраны толькі пасля ўмяшання першага сакратара ЦК КП Беларусі Пятра Машэрава.

У сярэдзіне 80-х беларускім кінарэжысёрам Міхаілам Пташуком пачынае здымацца аповесць «Знак бяды». Стужка выйшла ў 1986 годзе. Ён таксама з вялікімі цяжкасцямі ішоў да гледача. Кінастужку вазілі на ацэнку генеральнаму сакратару ЦК КПСС Міхаілу Гарбачову.

У 80-х гг. XX стагоддзя на экраны выйшлі яшчэ некалькі быкаўскіх фільмаў: «Фруза» (1981, рэж. У. Нікіфараў), «Круглянскі мост» (1989, рэж. А. Мароз), «Яго батальён» (1989, рэж. Карпаў-старэйшы), аднак нічым адметным гэтыя фільмы не вызначыліся [1].

Падчас «перабудовы» пачалі вяртацца імёны і творы рэпрасаваных пісьменнікаў. Васіль Быкаў, як і многія іншыя аўтары, звяртаецца да забароненых раней тэм: працягвае пісаць пра вайну, але цяпер у яго творах заўседы гучыць нацыянальнае пытанне: генацыд 30-х гадоў, праблемы нацыянальнай беларускай культуры і мовы.

На пачатку 90-х гадоў на «Беларусьфільме» выходзіць толькі адзін быкаўскі фільм: «На чорных лядах». У ім апавядаецца пра Слуцкае паўстанне, лёс беларусаў, якія змагаліся за самастойнасць Беларускай Народнай Рэспублікі. Па тэлебачанні фільм быў паказаны толькі некалькі разоў [3]. У 2004 годзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэжысёрамі Ірынай Пісьменнай і Мікалаем Дзінавым быў зняты дакументальны фільм пра Васіля Быкава «Доўгая дарога дадому…Рэквіем», але ён не атрымаў пракатнага пасведчання, як і фільм Віктара Корзуна «Вяртанне».

Экранізацыя твораў Васіля Быкава не спыняецца і зараз: кінафільм паводле яго аповесці «Пайсці і не вярнуцца» ў Беларусі здымалі расійскія кінематаграфісты на чале з Вольгай Жулінай. Гэта сведчыць аб тым, што таленавіты беларускі пісьменнік, які па-мастацку здолеў адлюстраваць усе цяжкасці і выпрабаванні беларускага народа, назаўсёды пакінуў свой след не толькі ў гісторыі сусветнай літаратуры, але і ў кінематографе.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ:

1.Аркуш Алесь Недазьняты Быкаў. – [Электоронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://arche.bymedia.net/2007-12/arkus712.htm.

2.Васіль Быкаў. – [Электоронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://be-x-old.wikipedia.org/wiki.

3.Команава, Т. Фільмы аб вайне. – Грамадска-асветніцкая газета «Культура». – Мн.: «Сайтекс», 2007

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ